# ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ КОМПЛЕКС

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
**Палякова В.І., 1 к., 3 гр., МПФ**
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – ст. выкл. Варанец В.І.

Горад Гомель – адзін з найстаражытнейшых гарадоў Беларусі, на сённяшні дзень з'яўляецца буйным індустрыяльным, прамысловым, навуковым і культурным цэнтрам.

Узнік Гомель, а ў той час Гомій, у канцы першага тысячагоддзя на землях усходнеславянскага саюза плямёнаў радзімічаў. Да часу першай згадкі ў летапісе ў 1142, старыя паганскія культы ў горадзе згаслі, ранейшая супольна-племянная арганізацыя змянілася княжацкай уладай. Гомій стаў тыповым старажытнарускім горадам.

У выніку мангола-татарскага нашэсця, шматлікіх княжацкіх міжусобіц насельніцтва і тэрыторыя горада рэзка скараціліся. І толькі з 18 стагоддзя пачынаецца яго паступовае ўзвышэнне.

Князь Міхаіл Фрэдэрык Чартарыйскі, ён жа канцлер Вялікага Княства Літоўскага, быў першым, хто спрабаваў ператварыць Гомель у культурны і эканамічны цэнтр рэгіёна.

Менавіта ён у 1730-я гады пачаў у Гомелі буйное будаўніцтва. На месцы старой крэпасці, якая размясцілася ў раёне старажытнага гарадзішча, ім быў узведзены магутны бастыённы замак з драўлянымі вежамі, сценамі і шырокім палацам, складзеным з векавых дубовых бярвенняў. У 1772 г. пасля далучэння гомельскага староства да Расеі ён адмовіўся прысягаць на вернасць імператрыцы Кацярыне ІІ і не захаваў за сабой гомельскі маёнтак.

На працягу 142-х гадоў (1775-1917 гг.) Гомельскім маёнткам валодалі Румянцавы і Паскевічы, выдатныя людзі Расійскай дзяржавы, дзяржаўныя, грамадскія і ваенныя дзеячы, якіх сучаснікі называлі «другімі», а часам і «першымі» асобамі.

Дваранскі род Румянцавых, па сямейным паданні, вядзе сваю гісторыю ад ніжагародскага баярына Васіля Румянца, які аказаў важныя паслугі вялікаму князю маскоўскаму Васілю Дзмітрыевічу пры заваёве Ніжняга Ноўгарада ў 1391 г. Узвышэнне роду Румянцавых адбылося ў першай палове XVIII ст. пры Аляксандры Іванавічы.

Графу Пятру Аляксандравічу Румянцаву-Задунайскаму Гомель з 5000 душ быў падораны імператрыцай Кацярынай ІІ «для забавы» за перамогу ў руска-турэцкай вайне. Абцяжараны дзяржаўнымі справамі, Румянцаў не адразу пачынае займацца падоранымі яму землямі. Упершыню з часу дарэння



Репозиторий ГрГМУ

Гомель згадваецца ў паперах фельдмаршала толькі 21 сакавіка 1776 года. У лісце да бліжэйшага сябра графа Завадоўскага ён піша: «...Пра паездку ў Гомель амаль не думаю». Толькі ў студзені 1777 г. ён дае першыя распараджэнні ў дачыненні да работ у Гомелі.

На тэрыторыі старажытнага замка Пётр Аляксандравіч задумаў пабудаваць палац, які па сваёй архітэктуры не быў бы падобным ні на адзін з існуючых у Расіі.

Цэнтральная частка сучаснага палацавага ансамбля была пабудавана ў 1777-1796 гг. Вырашана яна ў класіцыстычная стылістыцы. Да гэтага часу не ўдалося вызначыць імя дойліда, які ажыццявіў праект будынка. Створаны на паперы, праект быў ажыццёўлены ў Гомелі пад кіраўніцтвам архітэктара Якава Нікіціча Аляксеева, які знаходзіўся тут з пачатку будаўнічых работ да 1796 г. Ён выбіраў месца для будаўніцтва палаца, кіраваў нарыхтоўкай матэрыялаў, прызначаў працу майстрам.

Пасля смерці Румянцава палац атрымаў у спадчыну яго сын - вядомы дыпламат, дзяржаўны дзеяч і мецэнат Мікалай Румянцаў. У 1826 годзе ён памёр, і палац перайшоў да другога сына Пятра Аляксандравіча Румянцава - Сяргея Пятровіча Румянцава, які ўжо ў 1828 годзе заклаў замак, а ў 1834 - прадаў дзяржаве. У гэтым жа годзе палац за 800 тысяч рублёў быў выкуплены вядомым рускім вайскоўцам І.Ф. Паскевічам. Стаўшы ўладальнікам Гомельскага маёнтка, генерал-фельдмаршал Іван Фёдаравіч Паскевіч вырашыў правесці рэканструкцыю палаца ў адпаведнасці са сваімі запатрабаваннямі. З Варшавы быў запрошаны таленавіты архітэктар Адам Ідзкоўскі, які зрабіў істотныя змены ў абліччы палаца. Адным з архітэктурных праектаў стала збудаванне злева ад цэнтральнай часткі чатырох’яруснай вежы, якая несла на сабе сярэднявечныя рысы. Вышыня вежы - 32 м. Яна ўяўляе сабой вертыкальную дамінанту, арганізуючую вакол паркавую прастору. З аднаго боку да вежы прымыкае рызаліт і павільён з верхнім святлом, з другога - крытая веранда.

Іван Фёдаравіч Паскевіч, граф Эрыванскай, Найяснейшы князь Варшаўскі валодаў Гомелем з 1837, а апошняй гаспадыняй горада была графіня Эрыванская, светлая княгіня Варшаўская Ірына Іванаўна Паскевіч.

Памяццю аб сям'і Паскевічаў, з якой горад звязвалі 83 гады, жыве ці не ўвесь Гомель. Асаблівую любоў гараджане праяўляюць да Ірыны Іванаўны Паскевіч, якую доўгі час называлі «добрай гаспадыняй Гомеля, княгіняй Ірынушкай».

Сёння дзяржаўная гісторыка-культурная ўстанова "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль" мае статус вышэйшай гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.



Репозиторий ГрГМУ